Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. Узрастуць патрабаванні да вашай працы. Так што, магчыма, варта зменшыць аб'ём, але звярнуць увагу на якасць. Пры гэтым пажадана ўлічваць інтарэсы калег, праяўляць ініцыятыву, прапаноўваць новыя цікавыя ідэі. Некаторыя моманты вы можаце не заўважаць, цалкам апускаючыся ў сітуацыю, якая склалася, а з боку значна лепш бачныя некаторыя недахопы. Так што прыслухайцеся да парад сяброў.

ЦЯЛЕЦ. На гэтым тыдні поспех будзе актыўна вам усміхацца. Калі думаеце адпраўляцца ў вандроўку, то лепш гэта рабіць у панядзелак ці ў выхадныя. У першай палове тыдня можа вельмі парадаваць інфармацыя, якая паступіла ад блізкіх сяброў. Бліжэй да выхадных варта праявіць павышаную асцярожнасць да прывабных прапаноў, якія вы атрымліваеце. Усё не так проста, як можа здавацца на першы погляд.

БЛІЗНЯТЫ. Вы зможаце дасягнуць небывалых поспехаў у справах, асабліва гэта датычыцца творчай сферы. Простыя рашэнні дазволяць дабіцца матэрыяльнага дабрабыту. Абмен меркаваннямі з партнёрамі можа пакласці пачатак новай сферы дзейнасці. Паспрабуйце пазбавіцца ад сумневаў, негатыўных меркаванняў аб людзях і сітуацыях, будзьце дабрэйшымі і цярплівейшымі. Вас любяць і шануюць. У асабістым жыцці вас чакаюць важныя перамены, падобна, вам зробяць прапанову, якую даўно чакаеце.

РАК. Дастаткова напружаны тыдзень, затое ён дазволіць рэалізаваць многія магчымасці. У аўторак вам могуць прапанаваць цікавую работу. У сераду вас чакае неверагоднае спатканне. У чацвер могуць усплыць старыя нявырашаныя праблемы. Прысвяціце прыборцы і добраўпарадкаванню свайго дома хаця б адзін дзень. Паездка, прызначаная на нядзелю, пройдзе цудоўна.

ЛЕЎ. Адкіньце ўсе амбіцыі і паспрабуйце паводзіць сябе сціпла. Так вы больш даможацеся, чым калі будзеце чагосьці патрабаваць і выступаць з трыбуны. Паспрабуйце зрабіць тыя справы, якія важныя для вас у першую чаргу, інакш можаце захапіцца вырашэннем чужых праблем. Работа можа займаць дастаткова шмат часу, але па значнасці яна будзе далёка не на першым месцы. Не забывайце пра свой дом, навядзенне парадку і стварэнне камфорту ў ім.

ДЗЕВА. У пачатку тыдня давядзецца напружана працаваць, каб дабіцца жаданага выніку. Прыслухайцеся да інтуіцыі і праявіце ініцыятыву, тады з'явіцца магчымасць прасоўвання па службе. Ад далёкіх паездак і камандзіровак у чацвер і пятніцу лепш адмовіцца, бо яны не апраўдаюць вашых спадзяванняў. Бліжэй да канца тыдня асцерагайцеся інтрыг, якія могуць закруціцца вакол вашай персоны.

ШАЛІ. Стварылася спрыяльная сітуацыя для вырашэння старых праблем і задач. Вы апыняцеся ў цэнтры падзей, паспрабуйце захаваць нейтралітэт і не прымаць усё блізка да сэрца. Толькі не перастарайцеся з самакантролем і пунктуальнасцю на рабоце. Часам можна адпусціць сытуацыю і проста назіраць. Не выключана, што ў вас пачнецца раман з кімсьці, хто цяпер далёка.

СКАРПІЁН. На гэтым тыдні паспрабуйце пазбавіцца ад усяго непатрэбнага, дробнага, што перашкаджае вам як у прафесійнай дзейнасці, так і ў асабістым жыцці. Добры час для поўнага абнаўлення мэтаў і планаў. Пазбягайце мітусні і не саромейцеся смяяцца над сабой. У пятніцу пажадана навесці парадак у справах, якія датычацца асабістага жыцця. Прысвяціце каханаму чалавеку больш часу.

СТРАЛЕЦ. У пачатку тыдня пажадана зменшыць тэмп дзелавога жыцця. Затое зможаце ўзяць рэванш у наступныя дні, калі перад напорам вашай энергіі адступяць усе абмежаванні і перашкоды. У чацвер вельмі спрыяльныя кантакты са сваякамі, і пераважна асабістыя, не тэлефонныя — вылучыце час для зносін. Магчыма, у выхадныя вы пачнеце пераглядаць свой лад жыцця і паступова яго змяняць.

КАЗЯРОГ. Сабранасць і засяроджанасць дазволяць тварыць цуды. Пажадана планаваць аб'ём нагрузкі на рабоце. Задачы трэба вырашаць паступова, а не ў апошні момант. У аўторак нешанцаванне па дробязях можа выклікаць раздражненне, паспрабуйце пазбегнуць канфліктаў. Серада дазволіць пакінуць многія бескарысныя пытанні ў мінулым. Субота пройдзе ўдала.

ВАДАЛІЎ. Вам неабходна разумна падысці да рашэння даўно наспеўшай праблемы. Паспрабуйце адмовіцца ад эмоцый, цяпер яны будуць толькі перашкаджаць. Накіруйце сваю энергію на завяршэнне самай актуальнай у дадзены момант справы. Пятніца можа аказацца надзвычай прыемным днём, адбудзецца доўгачаканая сустрэча. У выхадныя пастарайцеся не перашчыраваць з выхаваннем дзяцей.

РЫБЫ. На працягу практычна ўсяго тыдня ў вас будзе роўны добры настрой, асабліва, калі вы дасцё сабе магчымасць адпачыць. Размераная плынь працоўных спраў напоўніць вас аптымізмам. Спрыяльны час для заняткаў творчасцю ці для паўнавартаснага адпачынку ў санаторыі. А вось у сямейным жыцці не выключаны канфлікты інтарэсаў. Дыпламатыя і такт дазволяць паспяхова спраўляцца з цяперашнімі праблемамі, у тым ліку і вельмі далікатнага характару.

СЁННЯ

Месяц

Поўня 25 студзеня. Месяц у сузор'і Дзевы.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.05	17.40	8.35
Віцебск —	9.00	17.24	8.24
Магілёў —	8.55	17.30	8.35
Гомель —	8.46	17.33	8.47
Гродна —	9.20	17.56	8.36
Брэст —	9.14	18.02	8.48

Імяніны

Пр. *Адама, Аўсея, Івана, Ільі, Іосіфа, Ісака, Ніны, Паўла, Сяргея.*
К. *Ангелікі, Анелі, Ілоны, Пшэмыслава, Юрыя, Яна.*

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

27 СТУДЗЕНЯ

1839 год — нарадзіўся Павел Платонавіч Чубінскі, фалькларыст, этнограф. У 1869—1870 гадах узначальваў этнаграфічныя экспедыцыі ва Украіну, у Беларусь і Малдавію. Аб'ездзіў Мазырскі, Пінскі, Кобрынскі, Слонімскі, Брэсцкі паветы. У «Трудах этнографическо-статистической экспедиции в Западно-Русский край...» змешчаны фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы з Мінскай і Гродзенскай губерняў: каля 400 песень, 25 казак, 5 апісанняў вяселляў, звесткі аб народных звычаях.

1889 год — нарадзіўся Іван Рыгоравіч Захаркін, генерал-палкоўнік. З чэрвеня 1943-га — намеснік камандуючага войскамі Цэнтральнага фронту, войскі якога падчас Чарнігаўска-Прыпяцкай аперацыі 1943 года пачалі вызваленне Беларусі. З кастрычніка 1943 года намеснік камандуючага Беларускім фронтам, войскі якога правялі на тэрыторыі Беларусі Гомельска-Рэчыцкую аперацыю (1943) і Калінкавіцка-Мазырскую аперацыю (1944).

1919 год — нарадзіўся Мікалай Міхайлавіч Альшэўскі, удзельнік вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза. Камандзір танка малодшы лейтэнант М. Альшэўскі вызначыўся пры вызваленні Віцебскай і Мінскай абласцей. Экіпаж пад яго камандаваннем 26 чэрвеня 1944-га ў баі каля в. Кіяелі Талачынскага раёна знішчыў танк «Тыгр», чатыры гарматы і восем аўтамашын з пяхотай праціўніка; на станцыі Коханава Талачынскага раёна вызваліў больш за 150 савецкіх грамадзян ад выгану ў Германію. У ліпені 1944 года пры ліквідацыі варожай групоўкі ў мінскім «катле» экіпаж на чале з ім знішчыў два танкі, 20 аўтамашын з ваенным грузам, 70 гітлераўцаў, узяў у палон больш за 200 салдат і афіцэраў ворага. Загінуў у баі ў 1944 годзе. Імем Мікалая Альшэўскага названа вуліца ў Мінску.

1879 год — нарадзіўся Павел Пятровіч Бажоў, рускі пісьменнік. Аўтар зборніка казак «Малахітавая шкатулка», аўтабіяграфічнай аповесці аб дзяцінстве «Зялёная кабылка» і інш. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

1924 год — у Маскве прайшло пахаванне У. І. Леніна (труна з забальзамаваным целам была змешчана ў часовы драўляны маўзалей).

1944 год — у выніку аперацыі «Студзеньскі гром» цалкам была знята блакада горада Ленінграда. У 1941 годзе Гітлер разгарнуў ваенныя дзеянні на подступах да Ленінграда, каб поўнасцю знішчыць горад. 8 верасня 1941 года кола вакол важнага стратэгічнага і палітычнага цэнтра замкнулася. 18 студзеня 1943 года блакада была прарвана, і ў горада з'явіўся калідор сухапутнай сувязі з краінай. 27 студзеня 1944 года савецкія войскі знялі фашысцкую блакаду горада, якая доўжылася 878 дзён.

ЛЮДВІГ ФЕЕРБАХ:

«Чалавек толькі тады нечага дабіваецца, калі ён верыць у свае сілы».

УСМІХНЕМСЯ

— У мяне экзістэнцыйны крызіс...
— Чаму?
— Ну, па-першае, я вывучыў гэта слова...

Джон Ракфелер марыў зарабіць 100 тысяч долараў і дажыць да 100 гадоў... А зарабіў 318 мільярдаў і памёр у 97.

Не ўсе мары здзяйсняюцца.

— Ты мяне кахаеш.
— Гэта пытанне?
— Напамін.

Калі я кажу, што ў мяне ўсё ляжыць на сваіх месцах, гэта азначае, што, калі мне патрэбна ручка, я адсоўваю халадзільнік і бяру ручку.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 12.292. Індэкс 63850. Зак. № 34. Нумар падпісаны ў 19.30 26 студзеня 2024 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12